*Рыма Кавалёва*

# Дыскурсіўная фальклорная проза

Дыскурсіўная фальклорная проза (познелац. discursus ‘разважанне’, ‘довад’; фр. discourse ‘маўленне’, ‘гаворка’) – від няказкавай прозы, звязаны з натуральнай камунікатыўнай падзеяй. Уяўляе сабой выказванні на традыцыйныя тэмы, якія тычацца сферы народнай культуры, – этнічных звычаяў, абрадаў, павер’яў, рацыянальных і міфалагічных поглядаў на свет, бога, чалавека, людзей і не-людзей, жывёл, птушак, раслін, прыродныя (ландшафтныя) і культурныя аб’екты (збудаванні, рэчы, прадметы і г. д.). Выказванні апелююць да калектыўнай фальклорна-міфалагічнай свядомасці і карціны свету. Яны не маюць строгай жанравай формы, існуючы ў свядомасці як пэўныя веды. «Прывязка» дыскурсіўнай прозы – канкрэтная жыццёвая сітуацыя з удзелам па меншай меры дзвюх асоб інфарманта і адрасата.

Дыскурсіўная проза складаецца з наступных частак: магічная проза – звод прадпісанняў, правілаў, парад, якія тычацца зместу і функцыі магічных дзеянняў (напрыклад: «*Каб жанчына пры родах доўга не мучылася, трэба пакласці ёй на пасцель нож і суровыя ніткі*»); міфалагічная проза – тлумачэнні, апісанні, паведамленні, звязаныя з міфалагічнымі ўяўленнямі аб з’явах прыроды, персанажах вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі, духах і нячысціках, аб чалавеку і частках яго цела, аб’ектах матэрыяльнай культуры і г. д. (напрыклад: «*А русалкі, хто іх знае, можа, эта дочкі вадзяніка, а можа, і ўтопленыя дзеўкі, я ж не знаю*»); каляндарна-абрадавая проза – выказванні аб каляндарных святах, абрадах, іх выканаўцах, паведамленні аб звычаях, напрыклад, аб купальскіх (распальванні вогнішчаў, пошуках папараці-кветкі, купанні на досвітку, пусканні вянкоў па вадзе, варажбе, назіранні за ранішняй «ігрой» сонца і інш.), юраўскіх («*На Юр’я рано, рано, до сонца выгонялы коровы на Юр’еву росу*») і пад.; сямейна-абрадавая проза – выказванні аб рэгламенце радзін, хрэсьбін, пахавання, памінання, вяселля і яго асобных абрадаў (напрыклад, сватання, заручынаў, зборнай суботы, пасаду, застрыгання, каравайнага абраду, вянчання і інш.); народна-хрысціянская проза – паведамленні пра Госпада Бога, Ісуса Хрыста, Прачыстую, святых прыпадобных, анёлаў і іншых персанажаў хрысціянскай міфалогіі, пра хрысціянскую тапаніміку і этыку – пра рай, апраметную, неба, грэх, дабро, зло і г. д.; сацыяльна-бытавая проза – разнастайныя чуткі, байкі, плёткі, пагалоска з такімі пачаткамі, як «мне казалі», «я чула», «кажуць», «перадавалі» і пад.

Галоўныя функцыі дыскурсіўнай прозы: інфармацыйна-тлумачальная (паведамленні аб існуючых з’явах народнай культуры, уяўленнях, маральных нормах і г. д.), рэгламентная, пабуджальна-засцерагальная (што і як трэба

рабіць, чаго пазбягаць і пад.), выхаваўчая (як сябе трэба паводзіць у розных абставінах, ставіцца да рэлігійных і народных звычаяў), аксіялагічная (акцэнтуецца грамадская каштоўнасць калектыўных ведаў).

У фальклорна-этнаграфічных выданнях дыскурсіўная проза падаецца ў адлюстраваным (штучным) выглядзе як больш-менш структураваныя адказы інфармантаў на традыцыйныя тэматычныя пытанні збіральнікаў, прыкладам, аб вясельных звычаях *гуляць разгуліны* (*банкеты, куру*), *ламаць печ, страляць зайца, вадзіць цыганоў* і г. д. Як правіла, натуральнае існаванне дыскурсіўнай прозы выключана з поля зроку збіральнікаў фальклору. Параўнаем: «*Як жанчына ў полазе, ёй кладуць на пасцель нож і суровыя ніткі, каб яна пры родах доўга не мучылася*» (адказ на пытанне збіральніка) і «*Ну што вы, жаночкі, глядзіце*! *Бачыце, як мучаецца! Хутчэй пакладзіце ёй на пасцель нож і суровыя ніткі*!» (натуральны камунікатыўны акт, пры якім магічная проза можа выступаць у форме парады, загаду, патрабавання, тлумачэння, перасцярогі, забароны, рэгламентацыі і г. д.)

Асноўны метад вывучэння дыскурсіўнай фальклорнай прозы – структурна-семіятычны з вызначэннем тыпалагічных элементаў выказвання і іх семантыкі.